рэты, а таксама балетныя пастаноўкі. У 1984 у будынку касцёла св. Роха адкрыта зала камернай музыкі Бел. філармоніі ( у першых канцэртах выступалі І.Архіпава, А.Янчанка і інш.). У М. гастраліруюць вядомыя калектывы і асобныя выканаўцы замежных краін. З 1992 у М. працуе Дзярж. аб'яднанне «Белканцэрт». У горадзе праходзяць фестывалі, у т.л. «Беларуская музычная восень», «Мінская вясна», «Я люблю балет», «Адраджэнне «Беларускай капэлы», конкурсы маладых музыкантаў-выканаўцаў, у т.л. з 1988 Рэсп. конкурс вакалістаў імя Л.Александроўскай, агляды, конкурсы, фестывалі самадз. маст. творчасці. Праведзены Усесаюзныя фестывалі майстроў опернага і балетнага мастацтва (1968), творчай моладзі тэатраў оперы і балета (1976, 1979, 1982), 1-ы Усесаюзны фестываль муз. тэатраў (1987), X Усесаюзны конкурс вакалістаў імя М.Глінкі (1981) і інш. Працуюць шматлікія аматарскія калектывы, лепшыя з якіх маюць званні «народныя» і «ўзорныя».

Кадры для муз. тэатра ў горадзе рыхтуюць Бел. акадэмія музыкі і Рэсп. вучэбны комплекс гімназія-каледж пры ёй, муз. вучылішча імя М.Глінкі, Бел. пед. ун-т, Бел. ун-т культуры; артыстаў балета — харэаграфічны каледж; педагогаў, харэографаў і гісторыкаў балета — кафедра харэаграфіі Бел. акадэміі музыкі (з 1994).

*Літ.*: Гісторыя беларускага тэатра. Т. 1—3. Мн., 1983—87; Ш и б е к о З.В., Ш и б е к о С.Ф. Минск: Страницы жизни дорев. города. Мн., 1990. С. 166—176; П а ш к и н Ю.А. Русский драматический театр в Белоруссии XIX в. Мн., 1980; Тэатры Мінска. Мн., 1973; К а л у б о в і ч А. На крыжовай дарозе. Мн., 1994. С. 261—278; Л и с н е в с к и й И.Е. В театр иду, как в храм. Мн., 1997. С. 27—71; Тэатры Беларусі. Мн., 1998; Ч у р к о Ю.М. Белорусский балетный театр. Мн., 1983; Я е ж. Белорусский театр в лицах. Мн., 1988; Я е ж. Линия, уходящая в бесконечность. Мн., 1999; Музыкальный театр Белоруссии: Доокт. период. Мн., 1990; Музычны тэатр Беларусі. Мн., 1993—97; С м о л ь с к и й Б.С. Музыкальный театр Белоруссии. Мн., 1963.

*Дз.У.Стэльмах* (тэатр. жыццё), *А.Л.Капілаў, Б.С.Смольскі.*

**МІ́НСКАЕ ЛІТАРАТУ́РНА-АРТЫСТЫ́ЧНАЕ ТАВАРЫ́СТВА**. Існавала ў Мінску ў 1906—09. Створана членамі забароненага *Мінскага таварыства аматараў прыгожых мастацтваў* В.Чавусавым, К.Фальковічам, С.Нейфахам, А.Зярновым і інш. Ставіла за мэту служыць згуртаванню мясц. дзеячаў літаратуры і мастацтва, садзейнічаць развіццю і пашырэнню літ. адукацыі і мастацтва ў Мінскай губ. Арганізоўвала т.зв. сямейныя вечары, на якіх ставіліся муз.-сцэнічныя і драм. творы. Так, 3.3.1907 аматары паставілі сцэны з оперы «Яўген Анегін» П.Чайкоўскага (у т.л. сцэна пісьма, сцэна ў садзе, сцэна дуэлі і заключная). Ролі выконвалі Н.Падгаецкая, В.Чавусаў і Альтшулер, акампаніраваў піяніст-аматар К.Какоўцаў. 15 вер. была паказана аперэта-вадэвіль у 2 дзеях «Жаночая цікаўнасць» (лібрэта і музыка Якаўлеўскага). Выканаўцы: рэжысёр таварыства М.Красноў (П'ер), В.Сушчынская-Пашкевіч (Марыета), М.Фейнберг (Граф); у 2-м аддзяленні Чавусаў праспяваў маналог Ермака з аднайм. оперы М.Рачкунова. Праз тыдзень адбыўся паказ аперэты «Гейша» С.Джонса. Гал. ролю з поспехам выканала Падгаецкая, партыю Ферфакса — Красноў (спецыяльна зрабіў новую рэдакцыю лібрэта), асабліва вылучыўся аматар Ярмілаў у ролі Імары. Сярод інш. выканаўцаў А.Альбрэхт (Молі) і Фейнберг (Вун-Чхі). Ставіліся і драм. творы, у т.л. «Рэвізор» М.Гогаля, «Назар Стадоля» Т.Шаўчэнкі. Спыніла дзейнасць з-за рэпрэсій.

*Літ.*: Музыкальный театр Белоруссии. Мн., 1990. Т. 1. С. 323—324; Б я с п а л а я М. Культурнае жыццё Мінска. Канец XIX — пачатак XX стагоддзя // Тэатр. творчасць. 1996. № 1.

*А.Л.Капілаў.*

**МІ́НСКАЕ МУЗЫ́ЧНАЕ ВУЧЫ́ЛІШЧА** і м я  М.І. Г л і н к і, сярэдняя спецыяльная навучальная ўстанова ў сістэме музычнай адукацыі. Засн. ў 1924 у Мінску на базе муз. школы (існавала з 1879), да 1937 наз. Бел. дзярж. муз. тэхнікум. Імя М.І.Глінкі прысвоена ў 1957. Рыхтуе спевакоў, дырыжораў, інструменталістаў, музыказнаўцаў, выкладчыкаў і інш. У 1925/26 адкрыты балетны, у 1927/28 оперны класы. Навучанне дзённае.

Выкладчыкі і навучэнцы М.м.в. вялі актыўную канцэртную дзейнасць. У 1925/26 навуч. г. пачаліся выступленні сімф. аркестра, у рэпертуары якога былі творы А.Глазунова, В.Калінніката, Р.Пуксга, Я.Цікоцкага, М.Чуркіна, І.Гайдна, Л.Бетховена. У 1928 оперны клас паставіў оперу «Фауст» Ш.Гуно пад кіраўніцтвам В.Цвяткова і І.Гітгарца (у перакладзе на бел. мову Ю.Дрэйзіна). Галоўныя партыі выконвалі навучэнцы Л.Александроўская (Маргарыта), П.Валадзько (Фауст), М.Цюрэмнаў (Мефістофель), у пастаноўцы ўдзельнічалі хор (50 чал.), аркестр (30 чал.), балет (20 чал.). Пастаўлены таксама оперы «Русалка» А.Даргамыжскага (1929), «Севільскі цырульнік» Дж.Расіні (1930). У 1930 на базе опернага і балетнага класаў створана *Беларуская студыя оперы і балета*.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Вучылішча адыграла значную ролю ў станаўленні і развіцці бел. музычнай культуры. У розныя гады выкладчыкамі працавалі М.Аладаў, Гітгарц, М.Маслаў, Л.Мухарынская, Г.Пятроў, Б.Смольскі, А.Баначыч, І.Бары, Дрэйзін, В.Несцярэнка, С.Нісневіч, В.Цвяткоў. Дзейнічаюць шматлікія творчыя калектывы. За час існавання М.м.в. падрыхтавала больш за 7 тыс. спецыялістаў, сярод іх Александроўская, У.Алоўнікаў, А.Багатыроў, В.Вуячыч, І.Балоцін, М.Дзянісаў, С.Друкер, Я.Еўдакімаў, Э.Зарыцкі, А.Кагадзееў, І.Абраміс, І.Любан, М.Пігулеўскі, Б.Смольскі, Р.Сурус, М.Фінберг, Э.Ханок, Л.Ганестава, Г.Пятровіч, Т.Раеўская, Я.Навуменка, Г.Радзько і інш.

*В.П.Пракапцова, Л.Я.Школьнікаў.*

**МІНСКАЕ МУЗЫЧНА-ЛІТАРАТУРНАЕ ТАВАРЫСТВА**. Існавала ў 1-й пал. 1880-х гадоў у Мінску. Арганізатар А.Сакалоў, старшыня К.Дзіберг. Аб'ядноўвала аматараў музыкі і літаратуры. Статут (зацверджаны 24.9.1880) прадугледжваў пашырэнне муз. адукацыі, адкрыццё муз. школ, развіццё муз. мастацтва, падтрымку кампазітараў, выканаўцаў і інш. Таварыства ўключала літ., хар., арк. і драм. секцыі. Наладжвала канцэрты, у якіх сімф. аркестр выконваў творы І.Гайдна, Л.Бетховена, Дж.Расіні, Ф.Абера і інш., муз. вечарыны, лекцыі аб жыцці і творчасці вял. кампазітараў і выканаўцаў. Грашовыя сродкі складаліся з узносаў праўдзейных членаў таварыства і членаў-наведвальнікаў. У рабоце таварыства ўдзельнічалі музыканты: скрыпачы М.Ельскі, В.Нядзведскі, Л.Ступель, піяністы А.Марбург, К.Пелегрыні і інш. Дзейнасць таварыства асвятлялася ў «Минских губернских ведомостях», у польскім перыяд. друку, у т.л. ў час. «Echo Muzyczne» («Музычнае рэха»).

*Літ.*: Капілаў А.Л. Музычнае таварыства ў Мінску // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1980. № 4.

*А.Л.Капілаў.*

**МІНСКАЕ ТАВАРЫСТВА АМАТАРАЎ ПРЫГОЖЫХ МАСТАЦТВАЎ**, ліберальна-дэмакратычная культурна-асв. і літаратурна-мастацкая арганізацыя. Існавала з 19.11.1898 да 25.7.1906. Створана на аснове музычна-драм. т-ва (1888—98) мясц. інтэлігенцыяй расійскай культурнай арыентацыі (А.Аляксандраў, С.Каменскі, Д.Мейчык, М.Мысаўской, Я.Окунь, К.Фальковіч, Я.Чырыкаў і інш.). У склад старшынь таварыства ўваходзілі Мысаўской (рэдактар газ. «Северо-Западный край»), С.Мядзведзеў, В.Чавусаў, А.Нікольскі, П.Мацвеева, А.Холмскі і інш. Мела на мэце кансалідаваць мастакоў і пісьменнікаў, дапамагаць прафес. і аматарскаму тэатру развіваць маст. адукацыю. Наладжвала маст. выстаўкі, канцэрты, спектаклі, публ. лекцыі і чытанні, імкнулася стварыць сваю школу сцэн. мастацтва. Мела літ., муз., выяўленча-маст. і драм. секцыі, свой аматарскі тэатр. Спектаклі наладжваліся з дазволу мясцовага паліцэйскага начальства па творах, дазволеных «драматычнаю цэнзураю пры Галоўным упраўленні па справах друку і без усякіх адступленняў ад дазволеных гэтаю цэнзураю арыгіналаў» (са Статута таварыства). Для падрыхтоўкі выхаваўча-асв. спектакляў для народа таварыству дапамагаў субсідыямі Мінскі к-т апекі нар. цвярозасці. Перавага аддавалася класічнаму расійскаму рэпертуару. Сярод пастановак: «Не ў свае сані не садзіся», «Свае людзі — паладзім», «Багна» і «Лес» А.Астроўскага, «Рэвізор» М.Гогаля, «Улада цемры» Л.Талстога, «Дзядзька Ваня» і «Чайка» А.Чэхава, «Снеданне ў прадвадзіцеля» І.Тургенева, «Маскарад» М.Лермантава, «Ідыёт» і «Злачынства і кара» паводле Ф.Дастаеўскага, «Пакаранне смерцю» Р.Ге, «Дзеці Ванюшына» С.Найдзёнава, «На двары ў флігелі» Чырыкава, «Шчаслівуцаў» У.Неміровіча-Данчанкі, «Дабрачынец» М.Сахарава, а таксама перакладныя творы — «Грашовыя тузы» А.Крукоўскага, «Гонар» Г.Зудэрмана, «Патанулы звон» і «Рамізнік Геншэль» Г.Гаўптмана, «Два светы» М.Нордава, «Нора» Г.Ібсена, «Малка Шварцэнкопф» Г.Запольскай, а таксама вадэвілі і інш. п'есы невяд. аўтараў. У якасці рэжысёраў выступалі М.Далгоў і М.Пігулёў, акцёры і інш. Карыстаўся шырокай папулярнасцю ў публікі спектакль «На дне» М.Горкага, які заставаўся ў рэпертуары таварыства да яго закрыцця. Гэта была адна з першых у Расіі пастановак п'есы. На літ. секцыі шмат увагі аддавалася новым плыням у драматургіі рус. і замежнай. Чыталіся і абмяркоўваліся даклады «Тургенеў як драматург», «Самыя новыя плыні ў драматычнай літаратуры — неарамантызм і рэалізм» Н.Далгова. Дыскусіі вяліся вакол драматургіі Чэхава, М.Метэрлінка, Гаўптмана, Л.Андрэева па дакладах С.Нейфаха пра п'есу «Вішнёвы сад» Чэхава, М.Караліцкага пра «Дачнікі» М.Горкага і інш. Зімой 1906 таварыства стала адным з апорных пунктаў рэв. руху ў Мінску. Губернатар П.Журлоў часова забараніў яго дзейнасць 8.2.1906 за тое, што таварыства выкарыстоўвала сцэну як трыбуну для прапаганды рэв. ідэй (многія сябры таварыства адкрыта заяўлялі пра сваю прыналежнасць да рэв. партый). Спроба старшынь таварыства захаваць яго як асв.-маст. арг-цыю не ўдалася. 25.7.1906 агульны сход

РЭПОЗІТОРИЙ БГУКИ